3. Караулов, Ю. Н. Русский ассоциативный словарь. От стимула к реакции : ок. 7 000 стимулов : в 2 т. / Ю. Н. Караулов [и др.]. – М. : АСТ-Астрель, 2002. – Т. 1. – 784 с.
4. Ожегов, С. И. Словарь русского языка / С. И. Ожегов. – М. : Рус. яз., 1983. – 815 с.
5. Черных, П. Я. Историко-этимологический словарь современного русского языка: в 2 т. / П. Я. Черных. – М. : Рус. яз., 1999. – Т. 1. – 624 с.

**Н. М. Борсук (г. Брэст, Беларусь)**

## ЭСТЭТЫКА ПРЫРОДЫ Ў ЗБОРНІКУ ГАЛІНЫ БАБАРЫКІ «ДАРОГА Ў ВОСЕНЬ»

Палеская зямля багатая на таленты. Літаратурная зорка Галіны Бабарыкі заззяла ў 2004 годзе, калі ўбачыў свет яе першы паэтычны зборнік “Давер”. Але вершы яна пачала пісаць значна раней, яшчэ будучы вучаніцай Мачульскай васьмігадовай школы, была юнкарам газеты “Зорька”, удзельнічала ў розных літаратурных конкурсах. З першымі публікацыямі Галіны Сідараўны можна пазнаёміцца на старонках газет “Піянер Беларусі”, “Навіны Палесся”, часопіса “Бярозка”. Духоўнае і аднachасова паэтычнае сталенне творцы супала з гадамі вучобы ў Магілёўскім педагагічным вучылішчы, Магілёўскім педагагічным інстытуце, настаўніцкай працай. Толькі ў роднай Мачульскай базавай школе яна працуе ўжо больш за трыццаць гадоў. Г. Бабарыка лічыць, што “кожнаму дадзены таленты. Таму не трэба іх, як кажуць «хаваць у зямлю»”.

На настаўніцу з палескай глыбінкі звярнулі ўвагу ды ўзялі апеку Л. Дранько-Майсюк, А. Крэйдзіч, якія далі ацэнку творчасці мастачкі слова ў прадмовах “Сястра пяшчоты” да зборніка “Давер” і “…Як чысты гром свабоды” да зборніка “Дарога ў восень” (2015); У. Карызна, па рэкамендацыі якога Г. Бабарыка стала членам Саюза пісьменнікаў Беларусі. Н. Парчук, беларуская паэтэса, звяртае ўвагу на пэўны філасафічны, разважлівы лад паэтычнага слова сяброўкі па пяру. Ці не таму, – разважае Надзея Мікалаеўна, – многія паэтычныя радкі творцы ўспрымаюцца як запаведзі: “*Веру, што не ўзрадуецца зло, / Свет уберажэцца ад udaraў…*”.

Як сведчыць прачытаны намі паэтычны зборнік “Дарога ў восень”, Галіна Бабарыка, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя У.А. Калесніка, здолела ўлавіць цэлы калейдаскоп карцін, увязаць у адзін вузел, далучыць да сябе. Назва гэтаму вузлу – вечнасць. Вечнасць разглядаецца мастачкай слова ў некалькіх аспектах: як бясконцая змена пакаленняў, пор года, дня і ночы, як несмяротнасць прыроды, існага, як перамога над сіламі зла, смерці, неўміручасць слова Маці: “*Дык спяшайся так жыць, каб душа прарасла / Ца нашчадкаў. Як кветка любові*” (верш “Думка пра жыццё”). Засяродзім нашу ўвагу на праблеме ўзаемаадносін чалавека і прыроды ў творчасці Галіны Бабарыкі.

Беларуская паэтэса на старонках зборніка "Дарога ў восень" прасочвае ўвесь цыкл у прыродзе і чалавечым жыцці – ад восені да лета. Яе гераіня не аддае перавагу ні адной пары года.

Восень для беларускай паэтэсы – гэта мудры і прасветлены час, які дапамагае кожнаму з нас убачыць, хто чаго варты на крыжы сусветных дарог: "*душа праз замець лістападу / На споведзь прад самой сабой, / Ішла, шырэлі далягляды, / А за спіной – гады сцяной...*" (верш "Развітанне з лістападам"). Менавіта гэтая пара года з туманамі, дажджамі, абдымкамі маразоў, сумным пошумам сосен дае магчымасць лірычнай гераіні засяродзіцца на сутнасным, падрыхтавацца да сустрэчы з зімой: "*Ні шэпту, ні мелодый / Між небам і зямлёй, / І толькі крок свабодна / Гаворыць з цішынёй*" (верш "Туман заліў пад ранак").

Адначасова восень разглядаецца паэтэсаю як сталасць чалавечага веку: "*Гэта жыццё падсумоўвае / Разам са мной лістапад*" (верш "Лістапад"). Восеньская пара дапамагае гераіні Г. Бабарыкі адчуць сябе часцінкай хуткаплыннага жыцця: "*Восені шчасце кароткае / Вецер ірве павуцінкай*" (верш "Асенняе шчасце"). Менавіта ў гэты час яна абвострана ўсведамляе, што перагорнута чарговая старонка кнігі жыцця. Адчуванне нявечнасці паглыбляецца праз вобраз ліста, які "*на дрэве – госць*" (верш "Развітанне з лістападам"), дзьмухаўца, "*жоўтага, маленечкага, ласкавага*", які ўспыхнуў у лістападзе "*нібы жыцця пасланец*" (верш "Лістапад"), вобраз павуцінкі. Параўнанне пейзажных замалёвак з павуцінкай згадвае аб празрыстаці, няпэўнасці чалавечага шчасця: "*То заплача яна, то пяе, / Павуцінкай плыве за акном*" (верш "Лістапад... Завітаў лістапад").

Тым не менш гераіня спяшаецца на сустрэчу з восенню (адсюль назва зборніка – "Дарога ў восень"), бо менавіта ў гэты час не толькі падсумоўваецца зробленае, але і нараджаюцца новыя планы, абуджаюцца надзеі: "*Ты чуеш? Словы новай песні / Кілім шапоча залаты*". Кілім – шарсцяны бязворсавы дыван ручной работы. У дадзеным кантэксце гэтае слова ўжыта ў пераносным значэнні. Традыцыю выкарыстання вобраза-сімвала назіраем у творчасці М. Калачынскага ("*Вясна пакрывала аблогі Кілімамі траў*"), У. Ляпёшкіна ("*Кінуў ім пад ногі верас светла-сіні / Няроўна вытканы кілім*").

Восеньская паэзія Г. Бабарыкі, на наш погляд, недастаткова багатая на фарбы прыроды. Але яна прадстае перад чытачом як носьбіт вытанчанай гамы настрою: то "*спадарыня восень*" плача, то пяе; то палоніць душы шэрасцю ("*Восень пейзажы / Тваё не люблю: / Шэрасцю мажаш / Нябёсы, зямлю...*"), то зачароўвае "*лісцевым пажарам*", "*пацеркамі калін*", дапамагае напісаць "*фарбамі лістоў / Залаты расказ*" (верш "Восеньскі расказ").

Карціны восеньскай прыроды даюць не толькі шчаслівае адчуванне рэальнасці, але і ўзбагачаюць чытача за кошт роздуму над вечным пытаннем "час – вечнасць". Пластычна-зрокавыя вобразы, мелодыі залатога паланеза, развітальнага вальса лістоты, гукі начнога раманса дапамагаюць чытачу адчуць крохкасць усяго жывога. Неабходна адзначыць, што Г. Бабарыка разглядае пейзаж у суб'ектыўна-псіхалагічным аспекце, што дазваляе паглядзець на праблему ўзаемаадносін чалавека і прыроды з пазіцый "чалавек – прырода – асоба".

У цэнтры ўвагі аўтара верша "Бусліныя крылы" знаходзіцца не столькі аб'ект у знешніх праявах (буслы, якія накіроўваюцца ў цёплы край), колькі чалавек у сваіх перажываннях аб нявечнасці ўсяго жывога. Праз вобразы-сімвалы, што абуджаюцца паэтэсаю з жыццёвага, мастацкага вопыту: палескія азёры – жоўты Ніл; перажытая радасць – сцішаны жаль, далёкі, са стратамі шлях – родныя краявіды; краявід, не мілы, не блізкі, – краявід, родны, лясны, – Г. Бабарыка перадае сум-тугу лірычнай гераіні па адыходзячым леце, па перажытай радасці і сцішаным жалі, якія "*адлятаюць у мінулае, можа, у вырай*". А паэтычныя радкі з верша "Жураўлі" ўспрымаюцца як рэквіем па продках, што адышлі ў іншасвет.

Паэтка спрабуе суаднесці малюнкі восеньскай прыроды са штодзённай дзейнасцю людзей, іх вытворчымі буднямі. Гэтая думка мэтанакіравана развіваецца ў вершах праз вобраз малінавага даспелага яблыка, які канцэптуальна суадносіцца з небам: "*Яблыкам малінавым даспелым / Сонца ападае за сады*" (верш "Музыка"); "*Вечар долы ціха сцеле, / сам малюе ён пастэллю / ў небе поўні яблык спелы*" (верш "Зімовы вечар"). Як бачна, пасаджанае руплівымі рукамі чалавека на зямлі ўзыходзіць у нябёсах.

У прыгажосці навакольнага свету, што цешыць вока, лірычная гераіня Г. Бабарыкі адчувае веліч і магутнасць Сусвету. "*Царствам дзіўнай прыгажосці*" ў розныя поры года прадстае перад чытачом лес. Асабліва вабіць ён гераіню ўзімку. Яна ўваходзіць у лес як "*у храм Гасподні*": "*Зімовы лес на прасціне снягоў / Заснуў, здалося, назаўсёды... / Найлепшы дар з глыбінь сівых вякоў – / Яго чысцюткі свежы подых*" (верш "Зімовы лес"). Прырода бачылася крыніцай мудрасці і для М. Рудкоўскага. Яго лірычны герой вучыцца ў зімовага лесу, як жыць, "*як смерць прымаць*" (верш "Пакуль што жывы ён, дзяцінства лес").

Нягледзячы на тое, што палітра белага колеру нязначная ("*Белай сінню, сіняй беллю / вечар долы ціха сцеле*" (верш "Зімовы вечар"); "*срабрысты ўзор красунь-бяроз*" (верш "Усмешка сонца ў час зімовы"); "*бель снягоў*" (верш "Туман заліў пад ранак"); "*А дрэвы ганарліва ўранку / Стаялі ў белапенных шалях*" (верш "Зіме нялюбай"); "*бела-сіні крочыць вечар*" (верш "Зімовы вечар")), паэтэса актыўна яе выкарыстоўвае. Як сведчаць вершы "Чаканне", "Тайнай нябёсаў азораны вечар" і інш.,

мастачка слова прабачае зіме жудасны напеў ветру, траскучыя маразы, “снягоў завейных парашуты”, стогн ад болю бязлістых дрэў, бо белы колер асацыіруецца для Г. Бабарыкі з ласкай, пяшчотай, верай у дабро: “*Бачыш, пад зімкі суроваю маскай / Тоіцца ласка, пяшчота... Не злосць*” (верш “Тайнай нябёсаў азораны вечар”). Дарэчы, белы колер выступае сімвалам чысціні і ў творчасці А. Дэбіша (верш “Зімовы дзень”). Па пераканванні Н. Мацяш, “*белы вір раўнавагі*” збліжае людзей, дапамагае пераадолець чалавечае гора. “*Белая аснежанасць*” (верш “А снег ідзе”) набліжае лірычнага героя М. Рудкоўскага да “*першароднасці святой*”, пазбаўляе яго ад пакутаў, узбагачае мудрасцю. Гэтыя назіранні дапамагаюць нам зразумець, чаму аўтар зборніка “Дарога ў восень” дазваляе сабе заўвагі, тыпу “Зіма нялюбая”. Прычына, думаецца, маральнага кшталту. Гераіні крыўдна, што і ў зімы не хапае сіл “беліць душы” (верш “Зімовы вечар”).

Безумоўна, індывідуальна-аўтарскія метафары, якія выкарыстоўваюць берасцейскія паэты, як сведчаць прыведзеныя вышэй прыклады, стымулююць фантазію чытача, дазваляюць яму ў працэсе ўспрымання прачытанага пайсці разам з творцамі па шляху асацыяцый і сінтэзу. Мы мелі магчымасць пераканацца, што вершы, скразным матывам якіх стаў зімовы, вызначаюцца філасафічнасцю, роздумам пра вечныя пытанні.

Вясна вабіць лірычную гераіню Г. Бабарыкі абуджэннем сіл у прыродзе і чалавеку: “*Вясна прастору гатавала, / Ручай блішчаў слязой снягоў*”; “*Адрузлы снег спаўзаў па даху*”; гарэзы-вераб’і *“свет абуджаць сваёю гамай*” (верш “Паміж вясною і зімой”), амаладжэннем: “*Зоркі-краскі пад сасной / Узышлі на ўзлеску – / Нам падораны вясной / Першыя пралескі*” (верш “Вясновыя малюнкі”). Яна жыве ў адпаведнасці з народным звычаем: “*І каб здаровым, моцным быць, / Убачыць бусла трэба гэтак: / Як ён не ходзіць, а ляціць – / такая ёсць у нас прыкмета*” (верш “У вышыні сярод смугі”). Час не знікае бясследна, ён застаецца ў жыццёвым і духоўным вопыце чалавека. Мужнасці, цярпенню, аптымізму вучыцца гераіня ў дрэва, што расло пры дарозе: “*Яго сякуць снягі, вятры, дажджы, / Галіны ледзянеюць на марозе, ... / Не наракае на гаротны лёс. / Нясе ўверх свае галіны / І кветкамі адорыць неба нас...*” (верш “Усё бліжэй да краю”). Аб чалавечым прызначэнні лёгка думаецца ў садах, асабліва вясной, сцвярджае Г. Бабарыка: “*Бомы, як голле і карэнне, / мы – і пачатак. Мы – і працяг...*” (верш “Як лёгка думаць у садах...”). Смерць успрымаецца гераіняй зборніка “Дарога ў восень” як непазбежная, невынішчальная з’ява: “*Кап, кап, кап, – пяе капеж, – / перайшла вясна рубеж” / Верабей сабе: “Чыў! Чыў! / Я дажыў! Я пераЖЫў!*” (верш “Сонечны сакавік”).

Заслуга беларускай паэтэсы Галіны Бабарыкі бачыцца перш-наперш у тым, што яна сілай паэтычнага слова імкнецца сцвердзіць, што гармонія

прыроднай красы – гэта неад'емная частка паўнавартаснага духоўнага жыцця чалавека. Пагадзіцеся, што духоўнае развіццё чалавека было б назаўсёды спынена, калі б у прыродзе раптоўна знікла шматколернасць, багацце формаў, разнастайнасць гукаў (гэтая думка з'яўляецца скразной у зборніку "Дарога ў восень"). Не дзіўна, што ў кожным апісанні прыроды Галінай Бабарыкай мы адчуваем прысутнасць чалавека-паэта ці яго лірычнага героя.

Што трэба паэту для працы? На гэтае пытанне паэтка адказвае: "*Паэту для творчасці трэба / Званочак-жаўрук у блакіце / І сінь васількавая ў жыце, / І крылы буслінья ў небе*" (верш "Інтэрв'ю з паэтам") – усё гэта і складае паняцце зямля Беларусі. Невыпадкова ў апісанні і выяўленні сваіх пачуццяў да роднага краю Г. Бабарыка звяртаецца да колеру васілька, які так прыгожа квітнее на лугах, палях у летнюю пару года. Валошкавы колер выклікае ўспаміны аб дзяцінстве: "*Прамуе дарога ў дзяцінства / Жытнёва-валошкавым полем*" (верш "Паэзія"). У лірычным малюнку Г. Бабарыкі зямля не знікае ў касмічнай прасторы, а расквечвае васількамі неба ("васільковае неба" (верш "Бусліныя крылы")), а "вочы Сусвету" – неба, месяц, зоры – адбіваюцца на зямлі: "*У травах кветак-зорак россып, / Туману шлейфы на дубах*" (верш "Вядзі мяне далей, сцяжына"), "*Павіс на голлі, / Дрэмле поўні жоўты шар*" (верш "Ноч"), "*Купаецца сонейка ў росах*" (верш "Паэзія"), "*Сусвет мірыядамі зорак / Расшыў парасон над зямлёй*" (верш "Здарожыўся дзень"). У М. Багдановіча, творчасцю якога захапляецца Галіна Сідараўна (верш "У вянок Максіму Багдановічу"), параўнанне нябеснага і зямнога канцэптуальна-светапоглядное, а ў аўтара зборніка "Дарога ў восень" – эстэтычнае. Як бачна, мастакі слова быццам спаборнічаюць у хараստве: "*Глядзіцца сонца ў люстры pocaў*" (верш "Вядзі мяне далей, сцяжына").

У трыялеце "Месяца таемнае святло" паэтэса працягвае дыскусію. Яна сцвярджае ўзаемасувязь і ўзаемазалежнасць зямнога і нябеснага жыцця. У паэтычным мысленні Г. Бабарыкі відавочна бінарная апазіцыя «свет – цемра», якая сведчыць пра адвечнае змаганне светлага і змрочнага пачаткаў у Сусвеце: "*Веру, што не ўзрадуецца зло, / Свет уберажэцца ад удараў, / Месяца таемнае святло / Льецца на бялёныя абшары*". З мэтаю паэтызацыі жыцця, уладкаванага па законах гармоніі і прыгажосці, паэтка апелюе да месяца як субстанцыі нейкага разумнага ўніверсуму. Разважанні творцы акумулююцца ў апошніх радках верша, што адпавядае структуры трыялета. Парушэнне схемы "абба бааб" паслабляе пазіцыю паэтэсы па вышэйакрэсленай праблеме.

Мы мелі магчымасць пераканацца, што Галіну Бабарыку з аднолькавай сілай вабіць хараство восеньскай, зімовай, вясновай і летняй прыроды. Важная рыса паэзіі нашай зямлячкі заключаецца ў тым, што

ў паэтэсы амаль няма вершаў сузіральніцкіх па адносінах да прыроды. Праз яднанне з прыродай і мастачка слова, і яе лірычная гераіня імкнуцца да духоўнага ўдасканалення.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Бабарыка, Г. С. Дарога ў восень : зб. вершаў / Г. С. Бабарыка. – Брэст : Альтернатива, 2015. – 132 с.

**В. А. Буднік (г. Брэст, Беларусь)**

## ПРАБЛЕМАТЫКА І НАТАРАЛАГІЧНАЯ СПЕЦЫФІКА АПАВЯДАННЯ І. ПТАШНІКАВА «ЛЬВЫ»

У апошні час у беларускай літаратуры пачынаюць гучаць трывожныя і заклапочаныя словы аб будучым нашай прыроды. Атручванне прыроды звязана з дзейнасцю чалавека, якая і прывяла да самай страшнай катастрофы сучаснасці – аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Гэтай тэме прысвечаны творы І. Шамякіна (“Злая зорка”), І. Пташнікава (“Львы”), Б. Сачанкі (“Родны кут”, “Запіскі аб радыяцыі”), М. Матукоўскага (“Бездань”), І. Чыгрынава (“Хто вінаваты”, “Толькі мёртвыя не вяртаюцца”), А. Дударава (“Адцуранне”) і інш.

Кожны пісьменнік па-рознаму падыходзіць да асэнсавання чарнобыльскай катастрофы. Некаторыя аўтары ў сваіх творах робяць акцэнт не на саміх падзеях Чарнобыля, а на тым, што адбылося пасля трагедыі: як змянілася жыццё людзей, як змяніўся іх светапогляд і як змяніліся іх каштоўнасці. Адным з запамінальных твораў аб трагічных наступствах гэтай цывілізацыйнай катастрофы з’яўляецца апавяданне І. Пташнікава “Львы” (1987). Па трагічнай напоўненасці, па стылю “Львы” – адзін з самых драматычных твораў на чарнобыльскую тэму ў беларускай літаратуры. У цэнтры твора вобраз сабакі Джукі, які застаўся адзін і не ведае, чаму яго малады гаспадар так доўга не вяртаецца дамоў. І. Пташнікаў абірае адметную манеру – паказвае падзеі, якія адбываліся ў атручанай радыяцыяй вёсцы, праз успрыманне сабакі.

Мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца даследаванне праблематыкі і нараталагічнай асаблівасці твора, аўтарскай манеры пісьма. У творы 2 групы герояў: ліквідатары, якія выконваюць загады, і вобраз жывой прыроды, якая гіне на стагоддзі. Праз успрыманне Джукі мы бачым не толькі свет людзей, але і прыроды. Багацце пачуццяў, думак такога героя вызначае арыгінальнасць наратыўнай мадэлі гэтага апавядання. У творы пераважае эмацыянальнае адчуванне жыцця. Джукі разумее: штосьці ідзе не так, як заўсёды, парушана яго звыклае жыццё. З першых радкоў твора